**Пытанні і заданні**

1. Якія даследаванні праводзілі Мікалай Капернік, Джардана Бруна і Галілеа Галілей? Да якіх высноў яны прыйшлі?
2. Якую небяспеку бачыла каталіцкая царква ў адкрыццях вучоных-астраномаў?
3. Як у XVII ст. змяніліся ўяўленні вучоных пра навуковае даследаванне? У чым сутнасць новага навуковага метаду?
4. Падумайце, чаму менавіта ў Новы час стала магчымым навуковае развіццё медыцыны. Растлумачце свой пункт гледжання.
5. Як вы думаеце, чаму найважнейшыя навуковыя адкрыцці XVII ст. атрымалі назву навуковай рэвалюцыі?

## § 6. Рэфармацыя ў Германіі

**1517 г.** **1524—1526 гг.** **1555 г.**

**Успомніце.** *Што такое інквізіцыя? Хто такія ерэтыкі? Якое месца ў жыцці сярэднявечнага чалавека займала царква? За што Ян Гус крытыкаваў каталіцкую царкву?*

Вялікія геаграфічныя адкрыцці і ідэі Адраджэння выклікалі змены ў жыцці людзей. Перамены закранулі і рэлігійную сферу. У XVI ст. амаль усе еўрапейскія краіны былі ахоплены рухам за рэформу (пераўтварэнне) каталіцкай царквы. У гісторыю гэты рух увайшоў пад назвай ***Рэфармацыя*** (ад лац. *reformatio* — пераўтварэнне). Рэфармацыя падарвала аўтарытэт каталіцкай царквы, прывяла да яе расколу і рэлігійных войнаў у Еўропе.

**Вы даведаецеся.** *Якія былі прычыны і вынікі Рэфармацыі. У чым заключаліся адрозненні паміж пратэстантамі і каталікамі.*

**1. Каталіцкая царква і прычыны Рэфармацыі.** У XVI ст. каталіцкая царква стала губляць свае пазіцыі. Распаўсюджваліся гуманістычныя ідэі, якія спрыялі фарміраванню свецкіх, гэта значыць нерэлігійных, каштоўнасцей і ўяўленняў. Развіццё навуковых ведаў прывяло да таго, што духавенства страчвала ўплыў на адукацыю і духоўнае жыццё

грамадства. Адказам на духоўны запыт вернікаў з'явілася Рэфармацыя каталіцкай царквы. Многія каталікі былі расчараваныя ў старых царкоўных парадках. Яны імкнуліся трансфармаваць царкву ў адпаведнасці з павевамі новай эпохі і патрэбамі людзей.

*На аснове пункта 1 складзіце ў сшытку лагічны ланцужок, які растлумачыць прычыны, што прывялі да пачатку Рэфармацыі.*

Аднак пазіцыі каталіцкай царквы былі яшчэ вельмі моцныя. У многіх краінах, асабліва ў Германіі, яна працягвала валодаць велізарнымі багаццямі, землямі, гарадамі, сёламі. Духавенства прапаведавала пагарду да жыццёвых даброт, але яго прадстаўнікі самі парушалі гэтае прадпісанне. Прага нажывы ахапіла многіх служыцеляў царквы. Біскупы і аканомы (настаяцелі) кляштараў, якія валодалі маёнткамі, вялі бяздзейны і абуральна раскошны лад жыцця за кошт прыгонных сялян. Нярэдка святары займаліся адкрытым вымаганнем пры здзяйсненні хрысціянскіх абрадаў (хрышчэнне дзіцяці, вяселле, пахаванне). Пасаду святара і нават біскупа можна было набыць за грошы, значыць, яе мог атрымаць і нявартны чалавек.

Незадаволенасць выклікаў гандаль індульгенцыямі, бо дараванне за здзейсненыя грахі і абяцанае месца ў раі мог купіць любы махляр або злачынец.

Нямецкія князі былі таксама незадаволеныя прэтэнзіямі царквы на свецкую ўладу. Дваране з зайздрасцю пазіралі на вялізныя ўладан-



*Якую прычыну пачатку Рэфармацыі ілюструе гравюра? Дайце назву ілюстрацыі.*

Гравюра *Ёрга Брэя Старэйшага.* Каля 1530 г.

ні і даходы біскупаў і манастыроў. Яны хацелі абмежаваць уплыў царквы на свецкую ўладу.

**2. Пачатак Рэфармацыі.** Масавы рух за пераўтварэнне каталіцкай царквы распачаўся ў Германіі. Ля вытокаў Рэфармацыі стаяў вучоны манах ***Марцін Лютэр*** (1483–1546), які адкрыта выступіў супраць гандлю індульгенцыямі.



54—55

58—59

Марцін Лютэр. Мастак *Лукас Кранах Старэйшы.* 1532 г.

У ***кастрычніку 1517 г.*** ён вывесіў на дзвярах царквы ў горадзе Вітэнбергу зварот да вучоных і духавенства — свае знакамітыя 95 тэзісаў (палажэнняў). Лютар абвясціў гандаль індульгенцыямі і адпушчэнне грахоў за грошы апаганьваннем хрысціянства. Адзіным шляхам да ўратавання чалавека абвяшчалася шчырая вера ў Ісуса Хрыста. Лютар лічыў, што сувязь паміж чалавекам і Богам ажыццяўляецца наўпрост праз Свяшчэннае Пісанне (Біблію) і не залежыць ад царкоўных абрадаў і ахвяраванняў. Ён сцвярджаў, што ўратаванне даруецца чалавеку непасрэдна Богам.

*Вызначце, ці ёсць падобныя рысы ў дзейнасці М. Лютэра і Я. Гуса.*

Такім чынам, тэзісы Лютэра адстойвалі права чалавека на самастойнае духоўнае жыццё. Яны мелі на ўвазе, што духавенства не можа быць пасрэднікам паміж Богам і людзьмі.

Летам 1520 г. Папа Рымскі Леў X адлучыў Лютэра ад царквы. У адказ мяцежны манах публічна спаліў папскую булу (пастанову) і тым самым канчаткова парваў з рымскай каталіцкай царквой. Ад немінучага арышту і смерці яго ратавалі нямецкія князі. Яны хацелі выкарыстаць Лютэра і яго вучэнне для таго, каб пазбавіцца ад апекі папскага Рыма і захапіць царкоўныя ўладанні. Знаходзячыся ў надзейным сховішчы, Лютэр за год пераклаў Біблію з лацінскай мовы на нямецкую. Цяпер вернікі маглі самастойна вывучаць Свяшчэннае Пісанне. У гэты час у Германіі ўспыхнула магутнае сялянскае паўстанне.

**3. Сялянская вайна ў Германіі 1524–1526 гг.** У Германіі ў пачатку XVI ст. захоўваўся жорсткі прыгнёт сялян князямі і дваранамі. Рух за абнаўленне царквы абудзіў у часткі насельніцтва веру ў магчымасць карэннага паляпшэння жыцця. Прыгнечаныя масы хацелі пераўтварэнняў

60—61



Напад сялян на рыцара. Гравюра *Майстра Петраркі.* XVI ст.

*Высветліце, чаму на сцягу намаляваны чаравік.*

у грамадстве згодна з літаральным тлумачэннем евангельскіх запаведзяў.

Улетку 1524 г. на поўдні Германіі разгарэўся пажар сялянскага паўстання, які неўзабаве ахапіў і іншыя раёны краіны. Правадыры паўстанцаў не імкнуліся да захопу палітычнай улады. Іх першапачатковыя патрабаванні былі памяркоўнымі і зразумелымі: скасаванне асабістай залежнасці сялян, памяншэнне паншчыны і аброку, наданне права на паляванне і рыбалоўства, якія з'яўляліся прывілеяй паноў. Сяляне абвясцілі пра гатоўнасць адмовіцца ад сваіх прэтэнзій, калі на аснове Бібліі будзе даказана, што гэтыя патрабаванні несправядлівыя. Паўстанцы хацелі, каб іх падтрымаў Лютэр. Але ён заявіў, што асабістая залежнасць сялян ад паноў не супярэчыць Бібліі, і асудзіў паўстанцаў.



Томас Мюнцэр. Гравюра *Хрыстафеля ван Зіхема.* 1608 г.

Паўстанне ў Цюрынгіі, размешчанай у цэнтры Германіі, узначаліў Томас Мюнцэр (каля 1490–1525). Яшчэ нядаўна гарачы прыхільнік Лютэра, ён




Сялянская вайна 1524–1526 гг. у Германіі

*Вызначце асноўныя раёны Сялянскай вайны.*

ператварыўся ў яго непрымірымага ворага. Мюнцэр публічна называў Лютэра «доктарам Люгнерам», гэта значыць хлусам, які прапаведуе пакорлівасць і дабраслаўляе катаў. Ён прарочыў адхіленне ад улады бязбожных прыгнятальнікаў і ўсталяванне на зямлі Царства Божага. Прапаведнік абвясціў барацьбу за поўную маёмасную роўнасць, за стварэнне свабоднай рэспублікі. А калі хто-небудзь з паноў будзе супраць гэтага, то яму, лічыў Мюнцэр, варта адсячы галаву ці павесіць.

Пад уплывам пропаведзяў Мюнцэра народныя хваляванні ахапілі гарады і вёскі. Сяляне адмаўляліся выконваць паншчыну, пратэставалі супраць абмежавання іх асабістай свабоды. Са зброяй у руках яны выступалі супраць феадалаў і каталіцкай царквы. Людзі спальвалі дакументы аб феадальных павіннасцях, грамілі кляштары і замкі, зачынялі цэрквы, вярталі абшчынныя землі. Аднак гарады не падтрымалі сялян у іх барацьбе з феадаламі. Князі і дваране бязлітасна задушылі паўстанне ў Цюрынгіі. Усяго за два гады Сялянскай вайны 1524—1526 гг.

было забіта больш за 100 тыс. паўстанцаў. Але не паспела краіна акрыяць ад адной вайны, як пачалася новая, рэлігійная.

**4. Лютэранская царква.** Між тым Лютэр заклікаў сваіх прыхільнікаў да стварэння новай царквы, незалежнай ад Рымскага Папы. Першымі адгукнуліся на заклік князі Паўночнай Германіі. Яны правялі ў сваіх уладаннях царкоўную рэформу: закрылі кляштары і захапілі царкоўныя землі. На чале царквы ў княстве станавіўся сам князь. Такая царква атрымала назву лютэранскай, а яе прыхаджане — лютэран. Святары лютэранскай царквы амаль нічым не вылучаліся сярод сваіх прыхаджан. Яны маглі жаніцца, насілі звычайную вопратку. Лютэранскія храмы і службы адрозніваліся сціпласцю і прастатой: у іх не было абразоў, скульптур Хрыста і Маці Божай, складаных абрадаў.

У 1529 г. імператар Свяшчэннай Рымскай імперыі Карл V заклікаў аднавіць каталіцкае багаслужэнне і выкараніць вучэнне Лютэра. Большасць нямецкіх князёў падтрымалі імператара. Аднак пяць князёў-лютэран і чатырнаццаць гарадоў заявілі пратэст. З гэтага часу прыхільнікаў царкоўнай рэформы сталі называць пратэстантамі, а іх вучэнне — пратэстантызмам.

Князі-пратэстанты аб’ядналіся ў саюз. Каталікоў узначаліў сам імператар. Паміж двума бакамі пачаліся працяглыя ваенныя дзеянні. Ваенная перавага аказвалася то на адным баку, то на іншым. Толькі ў ***1555 г.*** у Аўгсбургу быў падпісаны мір. Нямецкія князі атрымалі права прытрымлівацца сваіх рэлігійных перакананняў па прынцыпе: «Чыя краіна, таго і вера».

56—57

*Такім чынам, у выніку рэфармацыйнага руху на поўдні Германіі захаваўся каталіцызм, на поўначы зацвердзіўся пратэстантызм. Гэтыя рэлігійныя межы існуюць у краіне да цяперашняга часу. Аўгсбургскі рэлігійны свет прызнаў раўнапраўнымі каталікоў і пратэстантаў (лютэран). Адначасова ён замацаваў палітычную раздробленасць краіны.*

***Ключавыя словы:*** *Рэфармацыя, лютэране, пратэстанты.*

**Пытанні і заданні**

1. Назавіце асноўныя ідэі Марціна Лютэра.
2. Вызначце патрабаванні кіраўнікоў Сялянскай вайны ў Германіі. На што яны былі накіраваныя?

**3.** Складзіце ў сшытку схему «Асноўныя патрабаванні пратэстантаў».
**4.** Параўнайце погляды Марціна Лютэра і Томаса Мюнцэра па наступным плане: асноўная ідэя; пласты, чые інтарэсы прадстаўлялі; якія спосабы барацьбы прапаноўвалі.
**5.** Чаму рух за Рэфармацыю царквы стаў магчымым толькі у XVI ст.?
**6.** Ахарактарызуйце на падставе памяткі 1 (с. 221) Марціна Лютэра. Выкарыстайце для характарыстыкі тэкст вучэбнага дапаможніка, партрэт Марціна Лютэра, урыўкі з гістарычных дакументаў, прыведзеных у хрэстаматыі.

# § 7. Рэфармацыя і рэлігійныя войны ў Еўропе

**24 жніўня 1572 г.** **1598 г.**

**Успомніце.** *Якія пласты насельніцтва Еўропы і чаму былі незадаволеныя каталіцкай царквой?*

Ідэі Рэфармацыі хутка распаўсюджваліся па еўрапейскіх краінах. Зацвярджэнне новых ідэй суправаджалася крывавымі канфліктамі і нават рэлігійнымі войнамі. Каталіцкая царква аказвала ўпартае супраціўленне, спрабуючы задушыць рэфармацыйны рух.

**Вы даведаецеся.** *У чым адрозненні вучэння Жана Кальвіна ад ідэй Марціна Лютэра. Чаму кальвінісцкае вучэнне стала папулярным. Хто такія гугеноты і чаму Варфаламееўская ноч скончылася для іх трагічна. Асаблівасці Рэфармацыі ў краінах Еўропы. Што такое Контррэфармацыя.*

**1. Рэфармацыя ў Швейцарыі.** Другім пасля Германіі цэнтрам еўрапейскай Рэфармацыі стала Швейцарыя. Тут у 1536 г. асталяваўся французскі пратэстант ***Жан Кальвін*** (1509—1564), які пакінуў сваю радзіму, ратуючыся ад праследу. Гарадскія ўлады Жэневы прапанавалі яму правесці царкоўную рэформу. Кальвін заўзята пачаў справу. Ён стаў стваральнікам

61—62

*Як вы думаеце, чаму Кальвіна называлі «жэнеўскі папа»?*




Жан Кальвін. Гравюра 1562 г.

найбольш паслядоўнага пратэстанцкага вучэння — кальвінізму.

Жан Кальвін вучыў, што ўсёмагутны Бог падзяліў людзей яшчэ да нараджэння на дзве катэгорыі. Адных прызначыў да «ўратавання», або райскай асалоды, другіх да «пагібелі» — пекла і пакут. Бог, паводле Кальвіна, дапамагае сваім абраннікам, і таму ім заўсёды спадарожнічае ўдача. Няўдачы ж, якія пераследуюць чалавека, сведчаць пра няміласць Божую. І багацце, і галеча — усё ад Бога. Асуджаць багацце ці скардзіцца на галечу раўназначна спрэчцы з самім Богам. Гэтае вучэнне аб безумоўным прадвызначэнні адных да пагібелі, а другіх да выратавання стала галоўнай ідэяй кальвінізму, якая не аспрэчвалася.

Вучэнне Кальвіна больш за вучэнне Рымскай Царквы адпавядала інтарэсам гандлю, рамяства і прамысловасці. Бо згодна з ім прыбытак у камерцыйных справах лічыўся блаславёным, і пазыка грошай заахвочвалася.

Жэнева часоў Кальвіна прыкметна адрознівалася ад іншых еўрапейскіх гарадоў побытам і ладам жыцця людзей. Галоўнымі вартасцямі кальвінісцкая царква лічыла ўмеранасць, ашчаднасць і працавітасць. Атрыманы прыбытак кальвіністам нельга было траціць на раскошу і марнасць. Забараняліся гульні ў карты і косці, танцы і тэатр, нашэнне ўпрыгажэнняў. Не дазваляліся сямейныя ўрачыстасці з удзелам больш чым дваццаці чалавек. Жанчыны не павінны былі рабіць завіўку, а мужчыны — адпускаць доўгія валасы. Пасля дзевяці гадзін вечара ў дамах не запальвалі агню.

69—71

*Складзіце схему «Асноўныя ідэі Кальвіна».*

Кальвінісцкая царква ўціскала сваіх праціўнікаў. Тых, хто адважваўся крытыкаваць новае веравучэнне, чакала суровае пакаранне. Па рашэнні жэнеўскіх улад быў абвінавачаны ў ерасі і спалены іспанскі вучоны-гуманіст Мігель Сервет — праціўнік Кальвіна.

Пратэстанцкае вучэнне ў розных еўрапейскіх краінах прапаведавалі многія вучні Кальвіна.




Распаўсюджванне Рэфармацыі ў Еўропе

У XVI ст. ідэі Рэфармацыі пачалі пранікаць і на беларускія землі. Асноўнай сілай Рэфармацыі ў Вялікім Княстве Літоўскім, Рускім і Жамойцкім, у адрозненне ад заходнееўрапейскіх краін, былі шляхта і мяшчане. Найяскравейшым прадстаўніком рэфармацыйнага руху на беларускіх землях, якога вобразна называюць бацькам Рэфармацыі ў ВКЛ, быў адзін з лідараў кальвінізму Мікалай Радзівіл Чорны.

**2. Англіканская царква.** Як і нямецкія князі, іншыя еўрапейскія правіцелі таксама выкарыстоўвалі Рэфармацыю ў сваіх інтарэсах. Першымі з каталіцкай царквой парвалі каралі Даніі і Швецыі. Прыняўшы лютэранства, яны завалодалі кляштарнымі землямі і тым самым палепшылі сваё эканамічнае становішча. Частка зямель была перададзена дваранству, якое ператваралася ў верных слуг новай царквы і каралеўскай улады.

У Англіі кароль Генрых VIII спачатку варожа паставіўся да вучэння Лютэра. За гэта ён атрымаў ад Папы Рымскага тытул «абаронца веры». Але надта відавочныя былі выгады ад царкоўнай рэформы ў духу пратэстантызму. Кароль не мог упусціць шанец умацаваць сваю ўладу і папоўніць казну. Спачатку ён адмовіўся ад абавязковых плацяжоў папскаму Рыму. А ў 1534 г. парламент паставіў Генрыха VIII на чале царквы. Гэта азначала, што месца Папы заняў кароль. З гэтага часу царква ў Англіі стала называцца англіканскай.



71—72

Партрэт караля Генрых VIII. Мастак *Ганс Гольбейн Малодшы.* 1540 г.

У ходзе царкоўнай рэформы землі кляштараў былі прысвоены каралём і часткова распрададзены дваранам і багатым гараджанам. Кароль сам прызначаў біскупаў і размяркоўваў царкоўныя даходы. Пропаведзі ў цэрквах чыталіся на англійскай, а не на лацінскай мове, як раней. Духавенства атрымала права браць шлюб. Адначасова захаваліся багатае ўнутранае ўбранне храмаў, большасць каталіцкіх дагматаў і абрадаў.

Заўзятыя паслядоўнікі царкоўнай рэформы былі незадаволеныя такой палітыкай караля і імкнуліся ачысціць англіканскую царкву ад рэштак каталіцызму. Гэтых людзей у Англіі называлі пурытанамі (ад познелац. *puritas* — чысціня). Кароль Ген-

рых VIII, які кіраваў да 1547 г., у аднолькавай ступені ўціскаў і каталікоў, якія выступалі супраць царкоўнай рэформы, і пурытан, якія патрабавалі яе паглыблення. Па яго загадзе тысячы людзей былі пакараныя смерцю.

**3. Контррэфармацыя.** Каталіцкая царква актыўна выступіла супраць Рэфармацыі. Яе антырэфармацыйная палітыка ўвайшла ў гісторыю пад назвай ***Контррэфармацыі***.

*Як вы думаеце, што абазначае выраз: «Мэта апраўдвае сродкі»? Чыю дзейнасць у перыяд Контррэфармацыі ён характарызуе? Патлумачце свой адказ.*

Прыхільнікі Рэфармацыі былі абвешчаны ерэтыкамі. Гэта азначала, што хрысціяне-каталікі атрымлівалі права ўціскаць і забіваць пратэстантаў. Для барацьбы з Рэфармацыяй была створана спецыяльная арганізацыя — Таварыства Ісуса, больш вядомая як ордэн езуітаў. Узначаліў гэтае таварыства іспанскі дваранін Ігнасіа Лаёла (1491? –1556).

65—66

Езуіты атрымлівалі ўсебаковую падрыхтоўку. Яны былі добра адукаваныя, надзвычай спрытныя і цярплівыя. Дзеля дасягнення пастаўленай мэты езуіты мелі права на ўчыненне самых цяжкіх грахоў. Таварыства Ісуса адыграла вялікую ролю ў аднаўленні пазіцый каталіцкай царквы ў Еўропе і распаўсюджванні каталіцызму ва ўсім свеце.

*Пакажыце на карце Заходняй Еўропы XVII ст. дзяржавы, у якіх пераважала каталіцтва.*

- Стварэнне ордэна езуітаў
- Актывізацыя дзейнасці інквізіцыі
- Выданне спіса кніг, забароненых для ўсіх каталікоў
- Масавае вынішчэнне пратэстантаў
- Дзейнасць езуітаў у галіне адукацыі (стварэнне гімназій, калегіумаў, вышэйшых навучальных устаноў для навучання ў духу каталіцкай царквы)

Мерапрыемствы каталіцкай царквы супраць Рэфармацыі

Каталіцкай царкве ўдалося задушыць Рэфармацыю ў Польшчы, ВКЛ, Італіі, Паўднёвай Германіі. У гэтых краінах надоўга захаваліся феадальныя адносіны. Там жа, дзе замацаваўся пратэстантызм (напрыклад, у Англіі і Нідэрландах), пачалі хутка развівацца капіталістычныя адносіны.

**4. Рэлігійныя войны ў Францыі.** У Францыі таксама адбываўся падзел грамадства па рэлігійным прынцыпе. Да сярэдзіны XVI ст. тут з'явіліся шматлікія прыхільнікі кальвінізму, якіх называлі гугенотамі.

*З дапамогай картасхемы на с. 41 назавіце вобласці Францыі з пераважным уплывам кальвінізму і яго важнейшыя цэнтры.*



Варфаламееўская ноч. Мастак *Франсуа Дзюбуа*. XVI ст.

*У XVI ст. на карціне, якая паказвала гістарычную падзею, спакойна маглі спалучацца розныя часовыя пласты. І гэты твор — не выключэнне. Што адбываецца на пярэднім плане? Якія падзеі адлюстраваны на заднім плане?*

Правадырамі французскіх кальвіністаў былі Бурбоны — сваякі кіроўнай дынастыі Валуа. Барацьба за ўладу паміж Бурбонамі і арыстакратычным родам Гізаў, што абапіраўся на каталікоў, прывяла да крывавых ваенных дзеянняў.

Гугенотам дапамагала Англія, каталікам — Іспанія. На працягу больш чым 30 гадоў (1562—1598) Францыя была ахоплена братазабойчымі «гугеноцкімі войнамі».

Трагічным эпізодам тых войнаў сталі падзеі, якія адбыліся ў ноч на 24 жніўня 1572 г. — напярэдадні дня Святога Варфаламея. У Парыжы пачаліся забойствы дваран-гугенотаў. У гэты і наступныя дні па ўсёй Францыі каталікі забілі каля 20 тыс. гугенотаў.

У 1588 г. у Вільні быў выдадзены трэці Статут Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Ён уяўляў сабой звод усіх законаў, якія дзейнічалі тады ў ВКЛ, прататып канстытуцыі. Статут быў настолькі дасканалым, што дзейнічаў на тэрыторыі ВКЛ больш за 250 гадоў — да 1840 г. — і стаў узорам пры падрыхтоўцы зводаў законаў многіх краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Статут замацоўваў свабоду слова, веравызнання і рэлігійную памяркоўнасць.

У ходзе рэлігійных войнаў амаль усе правадыры каталікоў і гугенотаў загінулі. З усіх прэтэндэнтаў на французскую карону жывы застаўся толькі кіраўнік гугенотаў — Генрых Бурбон. Гэта быў хітры і выкрутлівы чалавек, які некалькі разоў мяняў веравызнанне, каб атрымаць уладу. «Парыж варты імшы», — лічыў Генрых Бурбон, таму ў 1593 г. ён перайшоў у каталіцтва і быў абвешчаны каралём Францыі пад імем Генрыха IV. Такім чынам, на французскім троне зацвердзілася дынастыя Бурбонаў.



Кароль Генрых IV Бурбон. Мастак *Франс Пурбус Малодшы.* Каля 1610 г.

У 1598 г. Генрых IV выдаў Нанцкі эдыкт (указ), які паклаў канец рэлігійным войнам. Каталіцтва абвяшчалася дзяржаўнай рэлігіяй, царкве вярнулі захопленыя землі і маёмасць. Але і гугеноты надзяляліся роўнымі з каталікамі правамі. Ім дазвалялася

вызнаваць сваю веру і нароўні з каталікамі займаць дзяржаўныя пасады. Гэта быў другі ў Еўропе закон аб свабодзе веры пасля Статута ВКЛ 1588 г.

*Такім чынам, зацвярджэнне ідэй Рэфармацыі нярэдка суправаджалася насіллем і крывапраліццем. Каталіцкая царква прыкладала сур'ёзныя намаганні, каб перашкодзіць распаўсюджванню пратэстантызму ў Заходняй Еўропе.*

***Ключавыя словы:*** *кальвіністы, пурытане, гугеноты, Контррэфармацыя.*

**Пытанні і заданні**

1. Чым адрозніваецца вучэнне Жана Кальвіна ад вучэння Марціна Лютэра?
2. Па карце ў атласе вызначце, у якіх дзяржавах шырокае распаўсюджанне атрымалі лютэранства і кальвінізм. Як вы думаеце, які горад назвалі Рымам кальвінізму? Чаму вы так лічыце?
3. Назавіце асаблівасці Рэфармацыі ў Англіі і Францыі.
4. Запоўніце ў сшытку параўнальную табліцу. Вызначце падобныя і адрозныя рысы веравучэнняў.

| Пытанні для параўнання | Каталіцтва | Лютэранства | Кальвінізм | Англіканства |
|---|---|---|---|---|
| Асаблівасці веравучэння аб уратаванні душы | | | | |
| Роля святароў | | | | |
| Вяршэнства ўлады | | | | |
| Мова набажэнства | | | | |
| Стаўленне да багацця царквы | | | | |

5. Уявіце, што вы размаўляеце з французскім каралём Генрыхам Бурбонам. Якія пытанні, што датычацца развіцця Францыі другой паловы XVI ст., вы яму зададзіце? Якія адказы вы маглі б на іх атрымаць? Запішыце пытанні і адказы ў выглядзе інтэрв'ю або разыграйце сцэнку з аднакласнікамі.